ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (1132) ● Чацвер, 27 мая 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ОРДЭНАМІ І МЕДАЛЯМІ СССР УДЗЕЛЬНІКАЎ І АРГАНІЗАТАРАЎ СТУДЭНЦКІХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ

За вытворчыя поспехі, дасягнутыя ў дзевятай пяцігодцы пры збудаванні прамысловых, сельскагаспадарчых і культурна-бытавых аб'ектаў у саставе студэнцкіх будаўнічых атрадаў, выдатную вучобу, актыўную навуковую і грамадскую работу ўзнагародзіць:

ОРДЭНАМ «ЗНАК ПАШАНЫ»

Семяненку Леаніда Уладзіміравіча — студэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

МЕДАЛЁМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ»

Бажэнаву Валянціну Віктараўну — студэнтку Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. ПАДГОРНЫ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль.
22 красавіка 1976 г.

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯХ

НАКАЗ КАМУНІСТАЎ

ПЯРВІЧНАЯ партыйная арганізацыя юрыдычнага факультэта—адна з буйных партарганізацый універсітэта — аб'ядноўвае ў сваіх радах больш двухсот камуністаў і каля паўсотні кандыдатаў у члены КПСС. Тут стаяць на ўліку такія ветэраны нашай партыі, як М. М. Клімко — член КПСС з 1918 года, Г. І. Рэзнік—з 1921 года, І. Д. Ветраў — з 1927 года, М. М. Меркушаў — партыйны стаж 49 гадоў. Старэйшыя камуністы з'яўляюцца асноўнай апорай партарганізацыі ў рабоце з маладымі членамі партыі, выхаванні іх на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях партыі і народа.

За справаздачны перыяд, як адзначыў у дакладзе на справаздачна - выбарным партыйным сходзе сакратар партбюро юрфака В. Г. Ціхіня, былі дасягнуты пэўныя рэзультаты ў справе далейшага дасканалення работы партыйных груп кафедр, курсаў і ўсёй партарганізацыі факультэта ў цэлым. На пасяджэннях бюро, сходах камуністаў сістэматычна абмяркоўваліся такія важнейшыя пытанні партыйнай работы, як павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, дасканаленне вучэбнага працэсу, выхаванне і навучанне студэнтаў у духу творчага авалодання ведамі, здольнасці правільна арыентавацца ў нарастаючым патоку палітычнай і навуковай інфармацыі.

XXV з'езд КПСС з'явіўся гістарычнай падзеяй у жыцці партыі. Ён вызначыў далейшыя вехі камуністычнага будаўніцтва. Камуністы юрыдычнага факультэта, натхнёныя рашэннямі партыі, намецілі шырокі план мерапрыемстваў па выкананню задач XXV з'езда КПСС. У справаздачным перыядзе на высокім арганізацыйна-палітычным узроўні на факультэце прайшло сацыялістычнае спаборніцтва пад дэвізам «XXV з'езду КПСС — дастойную сустрэчу». Вынікам вялікай работы, праробленай партбюро, дэканатам і грамадскімі арганізацыямі, з'явілася тое, што паспяховасць на юрыдычным факультэце склала 98,7 працэнта.

Істотна павысілася якасць выкладання прадметаў, што ў многім садзейнічала паляпшэнню падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Аднак, крытычна ацэньваючы сваю работу ў гэтым напрамку, партбюро юрыдычнага факультэта лічыць неабходным звярнуць увагу на ўдасканаленне падрыхтоўкі студэнтаў вячэрняга аддзялення і завочнікаў, нізкая паспяховасць якіх выклікае сур'ёзную трывогу.

Гэта — лепшы паказчык паспяховасці сярод факультэтаў універсітэта.

Як было адзначана на сходзе, адным з важнейшых напрамкаў у дзейнасці партыйнага бюро з'яўлялася работа з партгрупамі кафедры і курсаў. Гэтаму ў партарганізацыі юрфака ўдзялялася самая пільная ўвага. Так, на пасяджэннях партбюро абмяркоўвалася работа партыйных груп каферды грамадзянскага права, дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, партгрупы III курса і інтэрната. Разам з тым тут былі дапушчаны і недахопы: партбюро не ўвяло ў сваю практыку сістэматычнага абагульнення вопыту работы лепшых груп, не зрабіла яго здабыткам усёй партарганізацыі. Не атрымала пастаяннай прапіскі на факультэце і правядзенне семінараў партгрупоргаў.

У справаздачным перыядзе на пасяджэннях партбюро і сходах шырока абмяркоўваліся пытанні арганізацыі вучэбнага працэсу. Удасканальванне старых і ўкараненне новых тэхнічных сродкаў навучання ў вучэбным працэсе дазволіла ў многім палепшыць кіраўніцтва вучэбнай і вытворчай практыкай студэнтаў.

Аналізуючы стан навукова - даследчай работы, дакладчык падкрэсліў, што асноўным яе напрамкам з'яўлялася падрыхтоўка і выданне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па важнейшых юрыдычных дысцыплінах. **Усяго за 1975 год выкладчыкамі факультэта выдадзена 15 манаграфій і брашур агульным аб'ёмам звыш 100 друкаваных аркушаў. Калектыў вучоных прымае актыўны ўдзел у навуковых канферэнцыях, сімпозіумах як рэспубліканскіх, так і ўсесаюзных.** Многія з выкладчыкаў факультэта працуюць у навукова - кансультацыйным савеце пры Вярхоўным судзе БССР, у навукова - метадычным савеце Пракуратуры рэспублікі, навукова-тэхнічным савеце Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

За апошнія гады на факультэце прыкметна павялічылася колькасць навуковых даследаванняў, выкананых студэнтамі. У гэтым навучальным годзе на рэспубліканскі конкурс былі прадстаўлены 83 работы, на 21 больш, чым у мінулым годзе. Вынікі конкурсу сведчаць аб узросшай якасці студэнцкіх работ. 22 (у 1975 годзе — 12) работы прыняты па I катэгорыі. Тым не менш на факультэце мала распрацоўваецца комплексных тэм па буйных навуковых праблемах, якія патрабуюць намагання калектываў дзвюх і больш кафедр.

У комплексных планах ідэйна-выхаваўчай работы, у адпаведнасці з якімі канкрэтныя планы маюць камітэт камсамола, прафбюро, студсавет інтэрната, кураторы вучэбных груп, знайшла адлюстраванне рознабаковая дзейнасць партыйнага бюро па камуністычнаму выхаванню студэнтаў, кіраўніцтву грамадскімі арганізацыямі факультэта.

Аднак, адзначаючы дасягнутае ў гэтым напрамку, патрэбна спыніцца на істотных недахопах. Перш за ўсё, мала ўвагі ўдзялялася індывідуальнай рабоце са студэнтамі, дапускаўся фармалізм у арганізацыі пазавучэбнага часу і быту студэнтаў.

Вось ужо на працягу раду гадоў юрыдычны факультэт займае адно з апошніх месц ва універсітэце па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Выступаўшыя ў спрэчках старэйшы камуніст І. Д. Ветраў, камуніст І. І. Гарэлік указалі на дрэнную пастаноўку абаронна-масавай работы партбюро, патрыятычнага выхавання моладзі. Так, І. І. Гарэлік выказаў думку аб стварэнні групы «Пошук» на юрфаку для ўстанаўлення прозвішчаў студэнтаў і выкладчыкаў юрфака, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны, стварэнні на факультэце пакоя баявой славы.

Аб дасягненні больш цеснага кантакту партыйнага і прафсаюзнага бюро ў справе арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва на факультэце гаварыла дацэнт кафедры грамадзянскай абароны К. А. Бурзова. Яна адзначыла, што недахопам у арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва было аслабленне ўвагі партбюро на пытаннях галоснасці і кантролю. У прыватнасці, рабоце групы народнага кантролю ў справаздачным дакладзе не было ўдзелена месца.

Выступаўшыя ў спрэчках камуністы В. В. Левы, Э. А. Калініна, А. В. Дулаў, П. Я. Грынкін, Г. С. Драбязка спыніліся на тых пытаннях, на якія ў справаздачным перыядзе было звернута недастаткова ўвагі з боку партбюро. Гэта — размеркаванне грамадскіх даручэнняў, стан насценнага друку, удзел студэнтаў і выкладчыкаў у таварыстве «Веды», работа кураторaў

Сакратар камітэта камсамола факультэта А. Грынкевіч падрабязна спыніўся на становішчы і планах работы камсамольскай арганізацыі.

Недастаткова на факультэце арганізавана і палітыка-выхаваўчая работа ў інтэрнаце. А, між тым, з выступлення адказнага за работу ў інтэрнаце студэнта III курса У. Юрганава патрэбна зрабіць вывад, што гэты ўчастак работы патрабуе самай сур'ёзнай увагі з боку партыйнага бюро юрфака. Аб недахопах у рабоце партбюро па эстэтычнаму выхаванню студэнтаў гаварыў камуніст А. В. Дулаў.

На гэтыя і іншыя пытанні ўноў выбранаму партыйнаму бюро юрыдычнага факультэта патрэбна звярнуць самую сур'ёзную ўвагу — такі наказ сходу.

В. РОШЧЫН,
наш кар.

ПАРТЫЙНАЯ ХРОНІКА

На радзе факультэтаў універсітэта адбыліся справаздачна-выбарныя сходы. Ніжэй мы даём спіс кіруючых партыйных работнікаў універсітэта:

С. Д. Бачурын — сакратар партарганізацыі геафака, В. С. Аношка — намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце, А. В. Клёсава — намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце;

С. В. Говін — сакратар партарганізацыі журфака, А. А. Плаўнік — намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце, М. Я. Цікоцкі — намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце;

М. Т. Лапо — сакратар партарганізацыі НДІ ПФП, В. П. Давыдаў — намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце, М. І. Дзямчук — намеснік сакратара па палітыка-выхаваўчай рабоце;

Г. А. Мядзведзеў — сакратар партарганізацыі ФПМ, М. А. Палякоў — намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце, А. І. Мішук — намеснік сакратара па палітыка - выхаваўчай рабоце;

І. М. Саклакоў — сакратар партарганізацыі ўпраўлення, Л. Л. Барздоў — намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце, І. У. Арэхоўская — намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце;

В. Г. Ціхіня — сакратар партарганізацыі юрфака, М. А. Гарбар — намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце, В. В. Сарокіна — намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце.

ПА БДУ

18 мая ў БДУ працавала навуковая канферэнцыя маладых вучоных па тэме «Сучасныя праблемы аховы навакольнага асяроддзя». На канферэнцыі прысутнічалі маладыя вучоныя нашага універсітэта і іншых ВНУ.

У цяперашні час усё большая ўвага аддаецца пытанню ачысткі атмасферы, што мае вялікае значэнне для ўсяго чалавецтва. Аб існаванні чалавека ў біясферы, прычынах забруджвання навакольнага асяроддзя на канферэнцыі расказаў дацэнт, загадчык кафедры экалогіі і аховы прыроды БДУ імя У. І. Леніна У. П. Ляхновіч.

Старшы навуковы супрацоўнік інстытута філасофіі і права АН БССР П. А. Вадап'янаў паведаміў прысутным аб магчымасці і неабходнасці кіравання біясферай.

Пасля дакладаў быў зачытан рад паведамленняў аб ахове атмасфернага паветра ад забруджвання, аб тым, як пры дапамозе радыёактыўнага выпраменьвання вядзецца ачыстка сцёкавых вод некаторых прадпрыемстваў Беларусі, аб ролі глебаахоўных мерапрыемстваў у ахове прыродных рэсурсаў і іншых праблемах.

На здымках: з дакладам «Біясфера і чалавецтва» выступае дацэнт, загадчык кафедры экалогіі і аховы прыроды **У. П. Ляхновіч.**

Фота **Т. Петрашкевіч.**

* * *

24 мая адбылася III савецка-балгарская студэнцкая навуковая канферэнцыя. У праграме канферэнцыі былі выступленні прарэктара па рабоце з замежнымі студэнтамі І. П. Чэпы, савецкіх і балгарскіх студэнтаў. Прысутныя праслухалі даклады: «Інтэрнацыянальнае адзінства КПСС і БКП» студэнта V курса ФПМ Хрысто Ніколава, «Фестывалі моладзі — новая форма дружбы і супрацоўніцтва ВЛКСМ і ДКСМ» студэнткі III курса гістарычнага факультэта БДУ Н. Царук, «Развіццё балгарскай культуры на этапе будаўніцтва развітога сацыялістычнага грамадства» студэнткі III курса гістарычнага факультэта БДУ Л. Караткевіч, «Знешняя палітыка Народнай Рэспублікі Балгарыі» студэнта II курса ФПМ Пятра Тонева.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся дацэнт Сафійскага універсітэта імя Кліmента Ахрыдскага Йордан Тончаў. У заключэнне быў паказан дакументальны кінафільм «Лілія, дачка Георгіцы».

* * *

Завяршаецца вучоба ў сетцы палітычнай адукацыі. Пачаліся выніковыя семінарскія заняткі. Глыбокія веды паказалі слухачы семінараў, якімі кіруюць выкладчыкі БДУ прафесар В. С. Сцяпанаў і дацэнт У. А. Навіцкі.

* * *

На маючым адбыцца пасяджэнні парткома універсітэта будзе разгледжана пытанне кіраўніцтва прафсаюзнымі арганізацыямі факультэтаў. Зараз ідзе аналіз і абагульненне вынікаў дзейнасці масавых маладзёжных арганізацый.

СВЯТА СЯБРОЎ—СВЯТА МАСТАЦТВА

ФОТАРЭПАРТАЖ З АКТАВАЙ ЗАЛЫ УНІВЕРСІТЭТА

У ГЭТЫЯ сонечныя дні мая сінявокая прыгажуня-Беларусь сардэчна сустрэла сваіх сяброў, пасланцоў роднай сястры-Украіны. Гэта прадстаўнікі літаратуры

На трыбуне першы намеснік міністра культуры УССР Я. Д. Віташынскі.

і мастацтва Украінскай ССР, людзі, якія прывезлі з сабой не толькі цудоўныя песні аб сваёй старонцы, не толькі непаўторныя па каларыту нацыянальныя танцы, але і сяброўскія пачуцці, шчырыя словы братэрства.

Багатую і разнастайную праграму пакажуць нам майстры мастацтва УССР, у розных кутках Беларусі пабываюць нашы госці. А першая творчая сустрэча ўдзельнікаў Дзён літаратуры і мастацтва Украінскай ССР у Беларускай ССР адбылася ў нашым універсітэце.

На сустрэчу прыйшло шмат студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў ВНУ. Без перабольшання можна сказаць, што ў зале не было куды ўпасці яблыку. Сцэну ўпрыгожвалі, пламянеючы чырванню, сцягі Беларускай і Украінскай савецкіх рэспублік, кветкі, плакаты.

Ля ўваходу ва універсітэт гасцей чакалі кіраўнікі нашай установы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый БДУ. Дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных касцюмах паднеслі ўкраінскім сябрам хлеб-соль. Дэлегацыю ўкраінцаў узначальваў першы намеснік міністра культуры УССР, заслужаны дзеяч мастацтваў УССР Яраслаў Дзям'янавіч Віташынскі. Стоячы, шчырымі апладысментамі віталі ўсе сабраўшыяся ў актавай зале ўдзельнікаў дэкады літаратуры і мастацтва.

Са словамі прывітання да ўкраінскіх сяброў звярнулася сакратар партыйнага камітэта універсітэта дацэнт Т. Я. Дударава. Яна адзначыла вялікую радасць усяго беларускага народа, які прымае пасланцоў брацкай Украіны. Сяброўства нашых народаў мужнела і загартоўвалася ў гады першых пяцігодак, на франтах Вялікай Айчыннай вайны. І гэтую дружбу, як светач, мы пранясём у нашых сэрцах праз гады.

На трыбуне — кіраўнік творчай групы ўкраінскіх артыстаў Чаркаскі. Мы з вялікім хваляваннем, сказаў ён, ступілі на беларускую зямлю. Не менш хваляваліся мы і напярэдадні гэтай сустрэчы. Мы ўдзячны вам, беларускія сябры, за цёплы сардэчны прыём, упэўнены, што гэтыя дні дапамогуць нам яшчэ бліжэй пазнаёміцца з жыццём беларускага народа, што традыцыйныя вузы дружбы будуць яшчэ мацней.

Ад імя моладзі універсітэта выступіла студэнтка філалагічнага факультэта Людміла Дацэвіч. Мы добра ведаем і любім, сказала яна, цуда дружба паміж нашымі народамі, еднасць нашых літаратур.

Гасцей вітае студэнтка філфака Л. Дацэвіч.

Са словам у адказ выступіў першы намеснік міністра культуры УССР Я. Д. Віташынскі. Ён яшчэ раз напомніў, што ўкраінскі і беларускі народы звязвае вялікая дружба. «Сёння мы прывезлі вам у падарунак нашы самыя лепшыя танцы і песні, вершы, байкі, літаратурныя кампазіцыі, — сказаў Я. Д. Віташынскі.—Хай гучаць цудоўныя мелодыі пад мірным небам Радзімы. У гэтым наша вялікая гордасць — жыць, вучыцца, будаваць, засяваць палеткі на свабоднай савецкай зямлі». Апошнія словы патанулі ў буры апладысментаў.

Трыо бандурыстак.

Парадавала сваімі песнямі і салістка ансамбля «Ятрань» Антаніна Чарвінская. З чароўнымі мелодыямі Украіны пазнаёміў ансамбль пад кіраўніцтвам А. Асадчага.

Выступае «Ятрань».

Украінскімі хараводамі пачаўся вялікі канцэрт дзеячоў мастацтваў УССР. Цяжка знайсці словы, каб перадаць тую ўдзячнасць і захапленне, якія панавалі ў зале ў час выступлення самадзейнага ансамбля народнага танца з г. Кіраваграда «Ятрань». Ансамбль добра вядомы і на радзіме, і за мяжой. Ён лаўрэат многіх конкурсаў. І зараз кожны выхад артыстаў суправаджаўся гучнымі апладысментамі. Плаўны лірычны харавод змяніўся палымянымі іскрыстымі танцамі. Задор, сум, весялосць, узнёсласць мелодый спалучаліся з высокім майстэрствам выканаўцаў. Здавалася, ветрык спявае над украінскімі стэпамі, здавалася, Днепр магутны нясе ўдалячынь свае хвалі. Колькі раз выклікалі ўдзячныя гледачы танцораў на «біс»! Харэаграфічная мініяцюра «Вяселле» мела найбольшы поспех.

Не меншым поспехам карысталіся выступленні выпускніка Львоўскай дзяржаўнай кансерваторыі Уладзіміра Засухіна, заслужанай артысткі УССР Валянціны Кочур. Задушэўныя ўкраінскія песні прагучалі ў выкананні трыо бандурыстак, заслужаных артыстак УССР, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі УССР Н. Пісарэнкі, М. Галенкі, Т. Грыцэнкі. Гарачымі апладысментамі ўзнагародзілі прысутныя выканаўцу баек, дэкламатара, заслужанага артыста УССР Анатоля Панамарэнку. Усіх зачаравалі балетныя мініяцюры ў выкананні салістаў Тэатра оперы і балета Украінскай ССР Т. Таякінай і В. Коўтун, а таксама заслужанай артысткі УССР, лаўрэата міжнародных конкурсаў Л. Смаргачовай і саліста М. Прадчанкі. Песню А. Пахмутавай «Гарачы снег» праспяваў лаўрэат усесаюзнага і міжнароднага конкурсаў Анатоль Бойка.

Танцуюць Л. Смаргачова і М. Прадчанка.

Заканчвалася канцэртная праграма выступленнем народнага артыста УССР Анатоля Макрэнкі. Перад выступленнем ён сказаў:

— Я надта доўга быў студэнтам — 12 год, але не таму, што дрэнна вучыўся. У мяне захавалася студэнцкая душа: асабліва добра я адчуваю сябе іменна ў асяроддзі моладзі. З Беларусіяй мяне назаўжды звязала дружба са шчырымі людзьмі гэтага краю. І сёння я пачну сваё выступленне песняй свайго доўгага сябра, вядомага кампазітара Ігара Лучанка «Верасы».

Канцэрт закончан. Ад імя студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта дзяўчаты ў нацыянальных касцюмах паднеслі гасцям кветкі і сувеніры. У знак падзякі за выдатнае выступленне Т. Я. Дударава ўручыла кіраўніку дэлегацыі Я. Д. Віташынскаму сувенір —беларускага зубра, абгорнутага вышытым ручніком. Стоячы, зала апладзіравала сваім гасцям, апладзіравала за талент, за харошыя песні, жарты, танцы. Прыязджайце да нас яшчэ, сябры!

Т. СКАБЕЛЬСКАЯ,
Т. ПЕТРАШКЕВІЧ,
С. ШЫДЛОЎСКАЯ.
Фота **Т. Петрашкевіч** і **Г. Марозава.**

Гучаць украінскія нацыянальныя мелодыі.

ХРОНІКА ДЭКАДЫ

Дні літаратуры і мастацтва Украінскай ССР у Беларусі, якія пачаліся 24 мая і будуць праходзіць па 2 чэрвеня 1976 года, — значная падзея ў культурным і палітычным жыцці рэспублік.

Каляндарным планам Дзён прадугледжваецца правядзенне буйных грамадска-палітычных мерапрыемстваў, творчых сустрэч, канцэртаў.

✦

У Мінску будзе экспанавацца выстаўка выяўленчага мастацтва і народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці Украінскай ССР, выстаўка кнігі, фотавыстаўка «Савецкая Украіна».

✦

У Днях літаратуры і мастацтва прымаюць удзел шырока вядомы Дзяржаўны заслужаны акадэмічны украінскі народны хор імя Р. Вяроўкі, заслужаны акадэмічны ансамбль танца УССР, заслужаная капэла бандурыстаў УССР, Дзяржаўны сімфанічны аркестр, Закарпацкі народны хор, Кіеўскі камерны аркестр, перад слухачамі выступяць харавая капэла «Трэмбіта», ансамбль «Чэрвона рута» пры ўдзеле заслужанай артысткі рэспублікі, лаўрэата міжнародных конкурсаў С. Ратару, «Тарапунька» і «Штэпсель» — народныя артысты УССР Ю. Цімашэнка і Я. Бярэзін.

У канцэртах і вядучых партыях і спектаклях акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР гледачы пачуюць галасы народных артыстаў СССР Д. Гнацюка, Я. Мірашнічэнкі, А. Салаўяненкі, народных артыстаў УССР А. Макрэнкі, Н. Суржыной, Н. Манойлы і іншых.

✦

На сустрэчах з чытачамі, якія пройдуць ва ўсіх абласных цэнтрах, на прадпрыемствах і ў навучальных установах, выступяць вядомыя пісьменнікі, лаўрэаты Дзяржаўных прэмій СССР і Украінскай ССР Б. Алейнік, В. Казачэнка, М. Нагнібеда, П. Заграбельны, А. Левада, Герой Савецкага Саюза Ю. Збанацкі і іншыя літаратары.

✦

Прэм'ерай другога фільма «Буран» з трылогіі «Дума аб Каўпаку» у кінатэатры «Кастрычнік» 25 мая адкрыўся фестываль украінскіх фільмаў. У яго праграму ўключаны таленавітая карціна рэжысёра Ю. Ільенкі «Трывожны месяц верасень», удастоеная прэміі на Усесаюзным кінафестывалі ў Фрунзе, а таксама пераможца многіх конкурсаў — фільм Л. Быкава «У бой ідуць адны «старыя». У афішы фестываля мастацкія стужкі «Там, удалечыні, за ракой», «Белы башлык», «Канал», «Гусі-лебедзі ляцяць», «Хлапчукі ехалі на фронт» і іншыя, а таксама каля дваццаці дакументальных і навукова-папулярных карцін.

✦

У канцэртах і творчых сустрэчах аматараў музыкі прымае ўдзел вялікая група украінскіх кампазітараў — народны артыст СССР Г. Майбарада, народны артыст УССР І. Шамо, заслужаны дзеяч мастацтваў УССР А. Білаш і іншыя.

Хвалюючай падзеяй свята сталі Дні гарадоў-герояў Кіева і Адэсы ў горадзе-герої Мінску і крэпасці-герої Брэсце.

НІВОДНАГА АДСТАЮЧАГА ПОБАЧ

Камсамольскае жыццё

У ІНІЦЫЯТАРАЎ

Так ужо атрымалася, што зімовая сесія стала для студэнтаў ФПМ своеасаблівым «каменем спатыкнення». Пасля падліку паспяховасць склала 88 працэнтаў, у выніку чаго факультэт аказаўся на апошнім месцы. Тэрмінова трэба было прымаць рашучыя меры.

У пачатку семестра на агульнаўніверсітэцкім камсамольскім сходзе была адобрана ініцыятыва камсамольцаў ФПМ, філалагічнага, фізічнага, хімічнага факультэтаў аб арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва пад лозунгам «Ніводнага адстаючага побач!». Вынікі сесіі абмяркоўваліся ініцыятарамі пачыну на пасяджэннях камітэта камсамола, ВВК, на камсамольскіх сходах. Аднак галоўным усё ж было жаданне дапамагаць адзін аднаму. Студэнты II курса вырашылі стварыць кансультацыйныя пункты, дзе першакурснікам будзе растлумачвацца незразумелае, будуць праводзіцца кансультацыі па розных прадметах.

Кансультацыйныя пункты актыўна працавалі ўвесь другі семестр.

Акрамя гэтага, на ФПМ дзейнічаў савет выдатнікаў, на які была ўскладзена работа з непаспяваючымі.

— Значэнне савета выдатнікаў на нашым факультэце пакуль яшчэ невялікае. Асноўная яго задача ў гэтым семестры — аформіцца арганізацыйна, знайсці свае формы і метады работы. І ўсё ж якая ні малая роля савета выдатнікаў, ён нам вельмі дапамог,—гаворыць старшыня ВВК ФПМ Валерый Ракецкі.

Вядома, што паспяховасць залежыць і ад ступені наведвання заняткаў студэнтамі. Таму на факультэце праводзіліся праверкі, пасля якіх асабліва злосныя прагульшчыкі разбіраліся па пасяджэннях ВВК, крытыкаваліся ў лістках «КП» і нумарах «Маланкі».

Будзем спадзявацца, што вынікі работы, якая праводзілася на працягу другога семестра, адаб'юцца на летняй сесіі

І. БЕЛІК,
студэнтка II курса журфака.

ВЫНІКІ ЁСЦЬ

— Наша група па выніках зімовай сесіі аказалася лепшай на курсе. Але на гэтым заспакойвацца нельга. Трэба, каб ніводзін студэнт не меў здавальняючых адзнак. Для гэтага мала толькі асабістай зацікаўленасці. Трэба мець цвёрды абавязак перад групай, памятаць, што ад поспеху кожнага залежыць поспех групы, курса. Лепшай з форм, якая дапамагае ажывіць дзейнасць, лічыцца здаровы дух спаборніцтва. Прапаную падтрымаць спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!»...

Гэты сход адбыўся яшчэ 6 сакавіка. Наташа Стадуб —адказная за акадэмсектар у 3-й групе III курса хімфака — выказала думкі многіх камсамольцаў.

3-я група — гэта дваццаць чалавек плюс камсорг Святлана Сманцар. Вучацца добра. Ёсць прынцып: жыць толькі вучобай — гэта яшчэ не сапраўднае студэнцкае жыццё. Амаль кожны камсамолец групы — актыўны ўдзельнік грамадскай работы.

Летняя сесія пачалася. Вынікі будуць падведзены ў канцы. Але дадатковую праверку зрабіць усё ж неабходна. З гэтай мэтай і адбыўся камсамольскі сход. Аналіз паказаў: на працягу семестра ніводнай нездавальняючай адзнакі. Ну, а што скажуць суседзі, з якімі спаборнічалі, — 5-я група I курса? Сярэдні бал па выніках першага семестра тут склаў 3,87. А цяпер колькасць студэнтаў з выдатнымі адзнакамі значна павялічылася, ды і наведванне лекцый стала стопрацэнтным.

Гэта толькі пачатак, але пачатак станоўчы. Спадзяванні на добрыя вынікі летняй сесіі маюць грунтоўную падставу.

Л. САЯНКОВА.

ПАРАДЫ ЎРАЧА

З прычыны няправільнага размеркавання рабочага часу і адсутнасці фізічнай нагрузкі студэнты часта звяртаюцца са скаргамі на моцныя галаўныя болі, дрэннае запамінанне і разуменне вывучаемых прадметаў, трывожны сон. Пазбегнуць гэтых непрыемных з'яў можна шляхам арганізацыі правільнага рэжыму працы і адпачынку.

Аб рэжыме дня студэнта пісалі не раз. Студэнту трэба асаблівую ўвагу звярнуць на харчаванне (яно павінна быць рэгулярным і паўнацэнным) і сон. Вельмі шкодна займацца начамі. Спаць трэба не менш 8 гадзін, лепшы час дня сну з 23 да 7 гадзін.

Вельмі добрыя вынікі дае актыўны адпачынак — змена разумовай працы фізічнай. Заняткі трэба чаргаваць з адпачынкам: спартыўнымі трэніроўкамі, прагулкамі, катаннем на каньках, лыжнымі вылазкамі. На свежым паветры трэба бываць не менш дзвюх гадзін у дзень. Правільна адпачываць не менш важна, чым правільна працаваць.

Дастатковае харчаванне, знаходжанне на свежым паветры, здаровы адпачынак і сон — неабходныя ўмовы, якія папярэджваюць стамленне.

ПЕРШАЯ СТУДЭНЦКАЯ ВЯСНА

СТАРОНКА ПЕРШАКУРСНІКА

Першакурснікі, адарвіцеся на хвілінку ад канспектаў, закрыйце падручнік і перастаньце паўтараць суседу: «Я абсалютна нічога не памятаю»! Навокал — вясна. Ваша вясна. Першая студэнцкая, духмяная, сонечная і, канешне, непаўторная. Прычына — сесія. А ведаеце, што летнія сесіі здаюцца куды лепш, чым зімовыя? Апошні экзамен і... Наперадзе многа новага, захапляючага.

Гэтую старонку мы падрыхтавалі спецыяльна для першакурснікаў і аб першакурсніках.

ПЕРШАЯ студэнцкая вясна, і другая сесія. Ззаду засталіся першыя лекцыі, першая «бульба», страх перад першымі экзаменамі зімовай сесіі, карацей кажучы, — год напружанай вучобы. І добра, калі за гэты час першакурснікі змаглі стварыць у сваіх групах адзіны, спаяны калектыў.

«Моцная група» — так гавораць пра першакурснікаў 10-й групы фізфака. І сапраўды. Палавіну групы складаюць тыя,

ГРУПА? МОЦНАЯ!

хто прыйшоў у аўдыторыі універсітэта пасля службы ў радах Савецкай Арміі, работы на фабрыках і заводах, калгасных палетках.

...Нельга сказаць, што гэта група з'яўляецца самай лепшай на курсе па паспяховасці. Першая сесія: празмернае хваляванне, адсутнасць вопыту, недахоп літаратуры, акрамя таго, не ўсе ж могуць правільна весці канспекты. Для некаторых так і атрымалася, як гаворыцца ў народнай прымаўцы: першы блін — камяком. Але ўжо ў пачатку вучобы камсамольцы зразумелі: адзін у полі — не воін. І вельмі добра, што побач жывуць таварышы, гатовыя ў любую хвіліну прыйсці на дапамогу, што кожны адчувае адказнасць за паспяховасць і дысцыпліну ў групе, за стан спраў сваіх сяброў.

Будні студэнцкага жыцця... Гэта не толькі лекцыі, лабараторныя і практычныя заняткі. Гэта і калектыўныя паходы ў кіно, тэатр, сустрэчы з цікавымі людзьмі. Студэнты пазнаёміліся са старажытнай архітэктурай Беларусі, шмат даведаліся аб развіцці іканапісу, паслухалі цікавую лекцыю «Ля вытокаў класічнай фізікі». Усё гэта, вядома, садзейнічала згуртаванню групы ў адзінае цэлае, у калектыў.

Сярод першакурснікаў склалася даволі моцнае ядро актывістаў, аснова якога — камуністы. Іх у групе тры. Староста Браніслаў Чычыра, а таксама Вадзім Бянчук, Аляксандр Слесар, Аляксандр Скрыпкін задаюць тон у вучобе і наогул у жыцці групы.

ЯКІ Ў НАС КАЛЕКТЫЎ

У пачатку першага семестра група географаў-палітэканомаў падрыхтоўчага аддзялення па выніках вучобы плялася, як кажуць, у хвасце. Аб грамадскай рабоце і гаварыць было нечага. Гэта занепакоіла актывістаў.

Вырашылі пачаць з вучобы. Бо яна — аснова ўсяго. Запрасілі адстаючых на пасяджэнне бюро камітэта камсамола. Уважліва выслухалі, замацавалі за імі больш моцных студэнтаў.

Здаецца, нічога асаблівага не зроблена. Але за першы семестр група па вучобе заняла трэцяе месца.

Поспех заўсёды натхняе; хочацца ісці далей, дабівацца большага. Галоўнае тое, што кожны зразумеў і адчуў сілу калектыву.

Сумесна з групай філолагаў правялі «Агеньчык». Усім было цікава, усе засталіся задаволены.

Добрым сябрам групы стаў спорт. Футбольная каманда выйграла матчы ў юрыстаў і гісторыкаў. Гордасць усёй групы — Ігар Рудзянкоў. На нядаўнім першынстве па вольнай барацьбе сярод ВНУ Беларусі кандыдат у майстры спорту І. Рудзянкоў заняў другое месца. Ігар камуніст, добра вучыцца, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці.

І ў вучобе, і ў рабоце заўсёды напарадзе лепшыя. Пятро Лямешчанка, Віктар Лабзанюк, Валодзя Дашкевіч і многія іншыя задаюць тон, не пакідаюць нікога абыякавым да спраў калектыву, вядуць групу наперад.

УКЛАД КОЖНАГА

Каб паспяхова здзейсніць дэвіз «Вучыцца, працаваць і змагацца па-ленінску!», юнакі і дзяўчаты з групы біёлагаў падрыхтоўчага аддзялення пастаянна вывучаюць ленінскія работы, матэрыялы XXV з'езда КПСС. Слухачы рэгулярна рыхтуюць палітінфармацыі.

Пастаяннае імкненне знаходзіць новыя формы іх правядзення — плённы ўклад кожнага члена калектыву ў гэтую важную справу.

Падабраць змястоўны і цікавы матэрыял палітінфарматарам дапамагае адказны за правядзенне палітінфармацый Віктар Шачанок. Па яго ініцыятыве заведзен сшытак, у якім пасля абмеркавання запісваюцца неабходныя, на агульную думку, тэмы, замацоўваюцца дакладчыкі, намячаецца дата правядзення палітінфармацый.

Міма ўвагі групы не праходзіць ні адна значная падзея тыдня. Гутарка ідзе пра дасягненні навукі, тэхнікі, пра спорт. Хутка будзе праведзен вечар, прысвечаны творчасці Бетховена. Прагучаць творы кампазітара.

НА БАЯВЫМ ПАСТУ

«Баявы лісток» у групе філолагаў (беларуская мова і літаратура) стаў неад'емнай часцінкай іх жыцця. У «лістку» расказваецца пра камсамольскія справы, вучобу групы. Калі вывучалі творчасць Янкі Купалы, наведалі музей песняра. І «лісток» паведаміў пра хвалюючыя ўражанні ад наведання музея.

Напярэдадні свята Дня Перамогі група пабывала ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Вярталіся ўзрушаныя, хацелася падзяліцца думкамі, хваляваннямі. І хутка ў «Баявым лістку» паявіліся вершы слухачоў, прысвечаныя тым, хто адстаяў у нялёгкай барацьбе мір, шчасліваму маю, які так шчодра адорвае водарам квецені.

— «Лісток» у нас, — гаворыць адказны за выпуск Валерый Дубатоўка, — заўсёды на баявым пасту.

Мы на занятках па вышэйшай матэматыцы ў І курса (І паток, 2-я група) хімічнага факультэта. Ля дошкі першакурсніца Валянціна Курач. Выкладчык сведчыць: «Адказвае—добра!».

«ХАЦЕЦЬ— ЗНАЧЫЦЬ МАГЧЫ»

Любіць Валя вясну, любіць за яе зеляніну, за першыя кветкі і цёплыя сонечныя дні. Сёлетняя ж вясна ў жыцці Валянціны Дубінінай асаблівая. Справа ў тым, што сустракае яна яе студэнткай. Шмат часу марыла дзяўчына аб гэтай вясне. Колькі было розных нечаканасцей, перашкод на шляху, па якім ішла Валя на гістарычны факультэт універсітэта. Цяпер, калі ўсё засталося ззаду, не хапае часу для ўспамінаў аб былых няўдачах. З першых дзён вучобы Валянціна жыве ў імклівым рытме студэнцкага жыцця.

Аб існаванні народнага ансамбля «Крыжачок» першакурсніца даведалася ад сябровак. Хутка Дубініна была залічана ў асноўны састаў танцавальнага калектыву.

Сама Валя — мінчанка. Здаецца, нічым не адрозніваецца ад сваіх сябровак. Але... Нямала трэба мець настойлівасці, упартасці, каб у патрэбны момант зрабіць той нялёгкі крок наперад. Пасля 8 класаў дзяўчына паступіла ў Мінскае педвучылішча на аддзяленне культасветработы. Закончыла яго выдатна. У вучылішчы пачала ўсур'ёз займацца танцамі. Часам было цяжка, але Валя не адступілася. А як радавалася, калі ўсё пачало атрымлівацца, як у сябровак, а калінікалі і лепш. Дэвізам жыцця стала: «Хацець — значыць магчы».

Па накіраванню ёй выпала працаваць у Ленінградскім інстытуце культуры. Аднак абставіны склаліся так, што дзяўчыне прыйшлося застацца ў родным Мінску. Два гады працавала ў Мінскім абласным Доме народнай творчасці. За гэты час пабывала ў многіх гарадах і вёсках Беларусі. Яе зацікавіў фальклор. Потым адчула: патрэбны веды, грунтоўныя, трывалыя. Вырашыла паступаць на гістарычны факультэт БДУ. І паступіла.

Не прайшло і года, як Валянціна танцуе ў «Крыжачку», а ўжо за плячыма не адна гастрольная паездка. Вясна... Яна прынесла радасную вестку: ансамбль паедзе за мяжу, у Аўстрыю. Цяпер амаль кожны дзень — рэпетыцыі. Прыходзячы вечарам дадому, Валя бярэцца за падручнікі і канспекты — сесія.

...Мы сустрэліся з ёй на рэпетыцыі. Цяжка было паверыць, што гэтая рухавая дзяўчына прыйшла ў танцавальную залу пасля напружаных заняткаў і лекцый. Як толькі пачулася знаёмая мелодыя «рускага» — нейкая сіла падхапіла яе і закружыла ў віхуры танца... Прыпомнілася: нядаўна пасля агляду мастацкай самадзейнасці Дубініну назвалі лепшай танцоўшчыцай універсітэта. Нельга не пераканацца ў справядлівасці ацэнкі.

Шчаслівай вясны табе, Валя, шчаслівага білета на экзамене, творчага плёну!

ІНТЭРВ'Ю З БУДУЧЫМ НАСТАЎНІКАМ

— Прадстаўцеся.

— Аляксандр Папоў, студэнт І курса 7-й групы фізфака.

— Вы прыйшлі ва універсітэт адразу пасля школы!

— Так. Я заканчваў сярэднюю школу № 47 г. Мінска. Рыхтаваўся, паступіў.

— І не расчараваўся?

— Не было калі. Лекцыі, семінары, практычныя заняткі, бібліятэка — вучыцца вельмі цікава, але цяжка. Раней не думаў, што прыйдзецца так многа займацца. У школе было ўсё прасцей...

— Значыць, лічыш, што фізфак — самы цяжкі факультэт!

— Для кожнага студэнта свой факультэт самы цяжкі.

— Ну, а сесія!

— Прызвычаіўся. Канчаю здаваць залікі.

— Кім думаеш быць пасля заканчэння універсітэта!

— Настаўнікам. Мая маці — настаўніца, яна канчала геаграфічны факультэт нашай установы. Параіла і мне паступаць у БДУ. Я хачу прадаўжаць справу маці...

ЯКОЕ БУДЗЕ НАДВОР'Е?

— А што гэта за прылада?

— А для чаго гідраграф?

— Гэта ж усім вядома — для запісу вільгаці ў паветры! Лепш раскажы пра барометр.

Пытанні, пытанні, пытанні.... Іх узнікае вялікая колькасць у апошнія хвіліны перад залікам. На ўсё трэба даць адказ, каб і трынаццаты білет быў шчаслівым.

Першакурснікі геафака стоўпіліся ля стала, дзе расстаўлены прылады, пры дапамозе якіх можна меркаваць аб атмасферных з'явах, прадказваць надвор'е.

На тварах — хваляванне. Залік па метэаралогіі не цяжкі, але ж здаюць яго першакурснікі!

— Ну, хто самы смелы, заходзьце! — запрасіў экзаменатар Павел Антонавіч Каўрыга.

— Раскажыце аб прыладах-самапісцах, — звярнуўся Павел Антонавіч да Уладзіміра Леановіча.

Пытанне — адказ, пытанне — адказ...

— А што вы ведаеце пра піранометры?

Твар пунсовы ад хваляванння... Гэты злашчасны піранометр, прылада для вымярэння радыяцыі, якую вылучаюць сонечныя промні, з'явіўся «каменем спатыкнення». Не пашанцавала Леановічу. Прыйдзецца адказваць у другі раз. А вось Уладзімір Сугак пачаў свой адказ упэўнена. Неўзабаве ў залікоўцы паяўляецца жаданы запіс.

Уладзімір прыйшоў на факультэт з падрыхтоўчага аддзялення. А да гэтага была работа на заводзе, потым — служба ў арміі. Цяпер Сугак датэрмінова здае сесію — не за гарамі працоўны семестр, студэнцкі будаўнічы атрад.

— Гэта ж так цікава ведаць, чым і як жыве кожная расліна, жывёліна. Разумець з'явы, якія адбываюцца ў прыродзе! — адказаў Уладзімір на маё пытанне, чаму ён паступіў на геаграфічны факультэт.

А ў аўдыторыі «трымае бой» Ала Шаўроўская. Голас у дзяўчыны цвёрды, упэўнены. Павел Антонавіч усміхаецца — прыемна слухаць выдатны адказ. Ала з дзяцінства марыла аб падарожжах. У школе захаплялася кнігамі пра Магелана, Берынга і вось вывучае любімы прадмет у ВНУ.

Пасля сесіі студэнтаў чакае вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна», дзе яны прыменяць тэарэтычныя веды непасрэдна на практыцы, будуць самастойна адказваць на пытанне, якое надвор'е будзе заўтра.

Матэрыялы старонкі падрыхтавалі студэнты факультэта журналістыкі І. КУКСА, А. ЯНЧЭЎСКАЯ, Т. ГУСЕВА і слухачы падрыхтоўчага аддзялення М. КУРГАНСКІ і У. ДЗЯТЧЫК.

Фота С. ШЫДЛОЎСКАЙ.

У ІНТЭРНАЦЕ ВЕЧАР

Мы — савецкі народ;
нашай дружбе квітнець.
Рэвалюцыя дала нам
брацкую мову...

Гэтыя натхнёныя словы выдатнага ўкраінскага паэта, лаўрэата Шаўчэнкаўскай прэміі Міхаіла Ткача адкрылі вечар-сустрэчу ўкраінскіх пісьменнікаў і студэнтаў Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта, што жывуць у інтэрнаце № 2.

У госці да студэнтаў прыехалі паэт Міхаіл Ткач, аўтар шырока вядомых песень «Марычка», «Ой, не рэж касу», «Белы снег на зялёным лісці», «Ясені» і іншых, якія карыстаюцца папулярнасцю сярод моладзі; выдатны ўкраінскі гумарыст Аляксандр Кавінька і вядомы ўкраінскі празаік, аўтар шматлікіх хвалюючых прыгодніцкіх раманаў «Ювелір з вуліцы Капуцынаў», «Калекцыя прафесара Стаха» Расціслаў Самбук.

Студэнты сталі першымі слухачамі новых твораў М. Ткача «Мы — радянські народ», прысвечаных вялікім падзеям у жыцці народа, — XXV з'езду КПСС і XXV з'езду КПУ. Гарачымі апладысментамі сустрэла моладзь нядаўна народжаную песню М. Ткача і кампазітара А. Білаша «Ляцяць журавы».

Расціслаў Самбук захапіў слухачоў расказамі аб стварэнні прыгодніцкіх раманаў, аб подзвігах людзей, якія стаяць на варце спакою і мірнага жыцця, раскрыў некаторыя сакрэты пісьменніцкай выдумкі.

Для А. Кавінькі не патрэбна была рэкамендацыя, бо яго творчасць, ён сам ужо даўно завалодалі сэрцамі слухачоў. Ён часта выступаў па радыё і тэлебачанню. І вось А. Кавінька чытае свае гумарэскі сам і не толькі чытае, але і каменціруе іх. І амаль не адрозніш, дзе гумарэска, а дзе каментарый, бо кожнае слова гумарыста выклікае смех...

Р. ІВАНОВА,
дацэнт гістарычнага
факультэта КГУ.

У НАС У ГАСЦЯХ ГАЗЕТА

КИЇВСЬКИЙ УНІВЕРСИТЕТ

Владимир ВАЙЛОВ

ПАМЯТЬ

Мы помним Россию в
солдатской шинели,
Когда к ней шагнула
беда на порог,
Лесные землянки,
болота, траншеи
И горечь потерь
партизанских дорог.
Мы помним, как утро
войной начиналось
И плыл над Россией
тревожный рассвет,
Как вдовам в избу
«похоронки» стучались,
И люди смотрели нам
молча вослед...

Приходит к нам часто
священная память,
И вновь пред глазами
всплывает война,
Солдатское сердце
безжалостно ранит,
Как пуля, унесшая друга
тогда.
Роняют листву молодые
каштаны
На тихий курган и
холодный гранит,
В глубоком молчаньи
стоят ветераны,
И вечный огонь сердцем
Данко горит.



ГЛАВНЫЙ ЭКЗАМЕН

Преподавателям и студентам,
не вернувшимся с войны,
посвящается.

Когда мирный рассвет всколыхнула война
И горнисты тревогу пропели,
Когда в дом к нам нежданно ворвалась беда,
Все студенты надели шинели.
Вместо книг в руки взяв автоматы,
В строй солдатский шагнули они из-за парт,
Плыл над Киевом огненно-красный закат,
И горели родимые хаты.
Шли они по высоким хлебам,
Оставляя друзей на курганах,
Застывала горячая кровь на губах,
И саднили жестокие раны.
А над ними свинцовый гремел ураган,
И дымилася степь под ногами,
В бой смертельный их вел поседевший декан,
И вставала заря над полями.
Над могучим Днепром обелиски стоят,
Проплывают над ними туманы,
Тридцать лет непробудно студенты здесь спят,
С честью выдержав главный экзамен.

СУСТРЭЧА З ВЕТЭРАНАМІ

У залу заходзяць сівыя ветэраны, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Ззяюць на грудзях ордэны і медалі. Яны нагадваюць, колькі баявых дарог пройдзена, колькі гераічнага здзейснена... Нялёгкім быў шлях нашых бацькоў, якія са зброяй у руках абаранялі Бацькаўшчыну.

На сустрэчу былі запрошаны ветэраны 18-й арміі, генерал-лейтэнанты ў адстаўцы М. А. Салавейкін і Р. С. Булдовіч, падпалкоўнік у адстаўцы І. П. Краўчук і іншыя. М. А. Салавейкін захапляюча расказаў пра баявы шлях 18-й арміі, якая з баямі прайшла не адну тысячу кіламетраў. Свой расказ М. А. Салавейкін закончыў словамі:

— Мы марылі аб светлым дні нашай краіны, калі абаранялі яе ад ворагаў. Мы марылі пра мірнае неба над роднай старонкай, пра яе росквіт. І вось зараз радуецца сэрца—нашы мары сталі рэальнасцю. Радуецца сэрца, адчуваючы магутнасць нашай дзяржавы.

Франтавыя сябры пажадалі студэнтам выдатных поспехаў у вучобе.

В. МІХАЙЛЕНКА,
слухач аддзялення
журналістыкі
факультэта
грамадскіх прафесій.

Іван ПАКАЦІЛА

***

Уладзімір Ільіч!
Мы творы вашы
чытаем —
Пламянеем натхненнем
дум маладых.
Вы з трыбуны гісторыі
У сягоння гаворыце,
Як сучаснік,
Як жывы.
Мы —
Кастрычніцкіх баёў
маладыя нашчадкі —
Не мармуруем слоў
радкі.
Мы ад іх,
як зерне ад коласа,
Неад'емныя
На вякі.

Уладзімір РЫЗУН

***

Любоў сваю і думак
абсягі—
Усё аддам да кроплі,
да крупіны,
Калі зліюся ў адно
адзінае
З маім народам,
родным, дарагім.
Калі ж, як волат,
з яго я паднімуся,
Прайшоўшы ўсе
выпрабаванні свету,—
Не трэба мне пашаны,
славы, кветак,
Я — чалавекам смела
назавуся!

Василий КЛИЧЕК

БАЙКАЛО-АМУРЦАМ

Поезда, поезда,
кумачевые зори...
Песни юности будят
таежный простор.
Как сказать о ребятах,
сердцами которых
Зажигается в массах
кипучий задор?!.
Не для славы зовет их
тайга вековая,
И машины уходят в её
глубину,
Они дело отцов
в наши дни продолжая,
В свете утренних зорь
строят город-весну.

Іван НЯХОДА

ДНЯПРО-СЛАВУЦІЧ

З валдайскіх лясоў, між
дубоў сівавусых
Дняпро пачынае свой
шлях.
Расці ў ім шчодрасць,
блакіт Беларусі,
Украінскіх песень размах.
У стэпах бяскрайніх
Дняпро наш сінее,
Як стужка ў касе залатой,
Якую ўплялі Беларусь
і Расія
Сястры Украіне сваёй.
Разліўся Дняпро — волат
наш велічавы,
Магутная рэчка славян.
Краса Украіны, народаў
трох слава, —
Пявучы, крылаты баян.

Пераклад
Міколы ХВЕДАРОВІЧА.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

КАБІНЕТ І СЕСІЯ

Вось і надышоў час летняй сесіі. Запоўнены залы бібліятэкі — гарачая пара зараз у студэнтаў. Як жа падрыхтаваны да сесіі кабінеты? На гэта пытанне адказвае загадчык кабінета гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў Сяргей Васільевіч Плужнікаў:

— Для паспяховай здачы сесіі студэнты павінны прайсці добрую падрыхтоўку. Таму ў нашым кабінеце арганізаваны дзяжурствы выкладчыкаў. Студэнты ў любы час могуць звярнуцца да іх за кансультацыяй.

— Якая работа праводзіцца, акрамя кансультацый?

— Сістэматычна чытаюцца аглядныя лекцыі па такіх тэмах, як «Партыя — натхніцель і арганізатар перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі», «Асноўныя палажэнні ленінскай тэорыі сацыялістычнай рэвалюцыі і яе сусветна-гістарычнае значэнне», «Партыя ва ўмовах развітога сацыялізму» і іншыя. Яны акажуць вялікую дапамогу студэнтам. Акрамя таго, тут вывучаюцца важнейшыя работы У. І. Леніна, абмяркоўваюцца гістарычныя рашэнні XXV з'езда нашай Камуністычнай партыі.

— Колькі чалавек у дзень вы прыкладна абслугоўваеце?

— Цяжка сказаць нават прыкладна. Кабінет працуе з дванаццаці гадзін дня і да самага вечара. Кожны дзень дзесяткі студэнтаў наведваюць кансультацыі, слухаюць лекцыі.

— Якія цяжкасці бываюць у вашай рабоце?

— У цяперашні час праводзіцца рэканструкцыя кабінета, і таму адсутнічае кніжны фонд. Гэта стварае некаторыя перашкоды ў самападрыхтоўцы студэнтаў.

Інтэрв'ю правёў
В. МАРТЫНЕНКА,
слухач падрыхтоўчага аддзялення.

ЁН ВУЧЫЦЦА НА ВЯЧЭРНІМ

Празвінеў званок. Паступова пусцеюць аўдыторыі. У студэнтаў-вячэрнікаў закончылася, калі можна так сказаць, другая працоўная змена.

...Зняўшы рабочае адзенне, яны ідуць ва універсітэт, каб пачарпнуць як мага больш з кладоўкі ведаў. Нялёгка? Вядома. Патрэбна размеркаваць час так, каб яго хапіла на добрасумленную працу і паспяховыя заняткі, на авалоданне той прафесіяй, якая выбрана.

Вось пакідаюць аўдыторыю студэнты трэцяга курса юрыдычнага факультэта. Сярод іх і Васіль Забаронак. Ён не спяшаючыся ідзе да прыпынку. Твар яго задуменны, засяроджаны. Заўтра ў Васіля насычаны дзень, патрэбна яго распісаць па хвілінах, каб паспець зрабіць як мага больш.

Закончыўшы школу, ён паступіў у індустрыяльна-педагагічны тэхнікум і пасля яго заканчэння адразу ж пайшоў у армію. Тут маладога салдата палюбілі і за характар, і за прыкладную службу. Ён ніколі не стараўся выдзяляцца, але заўсёды быў наперадзе: у службе, у спорце, у вучобе. У 1971 годзе старшы сяржант В. Забаронак стаў чэмпіёнам Савецкай Арміі па вольнай барацьбе.

Пасля службы В. Забаронак паступіў на Мінскі завод халадзільнікаў. Сваю работу палюбіў, працуе з агеньчыкам. І ў тым, што група хімікаў аддзела забеспячэння, дзе ён працуе, заняла першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве ў 1975 годзе, ёсць і яго заслуга.

За добрую работу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці завода В. Забаронка рэкамендавалі кандыдатам у члены КПСС. Вядома, адказнасці і клопатаў прыбавілася.

Васіль Забаронак — старшыня савета інтэрната, член камітэта камсамола, член камітэта фізкультуры завода, курыруе секцыю цяжкай атлетыкі, член рэдкалегіі заводскай насценгазеты. Як бачыце, спраў шмат. Але В. Забаронак паспявае. Інтэрнат, старшынёй савета якога ён з'яўляецца, у сацыялістычным спаборніцтве на лепшы інтэрнат у 1975 годзе заняў першае месца ў Цэнтральным раёне Мінска і другое — у Мінскай вобласці.

В. Забаронак часта сустракаецца з рабочымі завода, якія вучацца ў школе рабочай моладзі. Кожнаму гатоў дапамагчы, параіць. Былі выпадкі, калі тыя, хто кідаў школу, пагаварыўшы з В. Забаронкам, зноў садзіліся за парту.

За якую б работу ён ні ўзяўся — выконвае яе добрасумленна. Васіля Васільевіча Забаронка ў 1975 годзе прынялі ў рады КПСС. Ён з гонарам апраўдвае аказаны яму давер. Зараз ён змагаецца за званне «Ударнік дзесятай пяцігодкі».

А. ПЕРХАРОВІЧ,
студэнтка вячэрняга
аддзялення факультэта журналістыкі.

● У АПОШНІ ЧАС

УЗНАГАРОДА ЗА ПОСПЕХІ

ТЭЛЕГРАМА

Сардэчна віншую ўдзельнікаў мастацкіх калектываў Белдзяржуніверсітэта з прысуджэннем прэміі ВЦСПС па выніках работы ў 1975 годзе. Жадаю новых поспехаў у справе камуністычнага выхавання моладзі, забеспячэння далейшага павышэння ролі мастацкіх калектываў у грамадска-палітычным, культурным жыцці ВНУ, выканання рашэнняў XXV з'езда КПСС.

18 мая 1976 года. Сакратар ВЦСПС Землянікава.

«КРЫЖАЧОК»—

УДЗЕЛЬНІК ЗАКЛЮЧНАГА КАНЦЭРТА

Аргкамітэт па правядзенню фестываля мастацкай творчасці працоўных горада-героя Мінска паведамляе, што народны ансамбль танца «Крыжачок» Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з'яўляецца ўдзельнікам заключнага канцэрта фестываля.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 02480 Заказ № 756.

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.